# ИСТОРИЧЕСКАЯ ДИНАМИКА И ДУХОВНАЯ КУЛЬТУРА ОБЩЕСТВА: РЕГИОНАЛЬНЫЙ И ГЛОБАЛЬНЫЙ КОНТЕКСТ

## ГУМАНІТАРНАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ Ў СТАНАЎЛЕННІ НАЦЫІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВІЦЕБСКА)

*В.У. Акуневіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Репозиторий ВГУ

Інтэлігенцыя з'яўляецца неад'емнай і ў многім вызначальнай у любой нацыі. Велізарную ролю яна адыгрывае ў фарміраванні і развіцці нацыі, станаўленні яе дзяржаўнасці. На рубяжы XIX–XX ст. ішоў працэс станаўлення беларускай нацыі, дзе выключную ролю мела інтэлігенцыя. Месца ў гэтай кагорце гуманітарнай інтэлігенцыі г. Віцебск з'яўляецца да гэтага часу недастаткова вывучанай. Больш таго яе дзейнасць падаецца як заходнеруская грамадска-культурная плынь («западнорусизм»).

Мэта даследавання – выявіць месца і ролю інтэлігенцыі Віцебска ў нацыятворчых працэсах, іх асаблівасць у сувязі з усходнім геапалітычным становішчам рэгіёна.

**Матэрыял і метады.** Крыніцамі для напісання працы з'ўляліся фонды дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і ведамасных архіваў. У даследаванні выкарыстоўваліся як агульна-навуковыя, так і спецыяльна-гістарычныя метады. Гісторыка-генетычны метад вывучэння архіўных матэрыялаў дазволіў прасачыць змены як у палітычнай сітуацыі, так і эвалюцыю пагляdaў прадстаўнікоў гуманітарнай інтэлігенцыі. Гсторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны метады выявілі сістэму з'яў, якія былі характэрны для часу станаўлення беларускай нацыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Фарміраванню беларускай нацыянальнай гуманітарнай інтэлігенцыі спрыялі тыя абставіны, што ў г. Віцебску дзейнічалі: цэнтральны архіў старажытных актаў (1852–1903 гг.), губернскі статыстычны камітэт, якія праводзілі навуковыя, у т.л. гістарычныя, даследаванні. Тут пачынаў сваю творчую дзейнасць адзін з заснавальнікаў "заходнерусізму" К.А. Гаворскі, сакратар губстаткамітэта і рэдактар неафіцыйнай часткі "Витебских губернских ведомотсей", дзе публікаваліся яго артыкулы па гісторыі Віцебшчыны. З Віцебскам звязалі свой лёс і творчую дзейнасць такія вядомыя навукоўцы, прадстаўнікі заходнерусізму, як Е.Р. Раманаў, М.Я. Нікіфароўскі, А.П. Сапуноў, А.М. Семянтоўскі, У.К. Стукаліч, П. Шэйн і інш. Некаторыя з іх прымалі ўдзел у стварэнні і дзейнасці Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (1909-1919 гг.), якая шмат зрабіла для збору і публікацыі дакументаў, папулярызацыі гістарычных ведаў і, у першую чаргу, па гісторыі Беларусі і Віцебшчыны, Па ініцыятыве камісіі у Віцебску працавала (1911-1922 гг.) аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута, дзе вялася падрыхтоўка кадраў вучоных архівістаў, археолагаў і мастацтвазнаўцаў. Да 1917 г. аддзяленне закончыла 60 чалавек, з іх 12 у далейшым абаранілі дысертацыі. Плённая і шмат-гранная праца паставіла тым самым, у тэарэтычным плане, беларускае пытанне.

Сабраны фактычны матэрыял ставіў гісторыкаў у супярэчнасць з ідэалагіччнымі догмамі і тэарэтычнымі аксіёмамі вялікадзяржаўнай расійскай гістарыяграфіі і заходнерусізму. У гэтай сітуацыі яны аддавалі перавагу аб'ектыўным фактам самабытнай гісторыі і культуры Беларусі. Як пісаў А.Цвікевіч, "заходнеруская" абарона Беларусі была такой натхнёнай і ўсебаковай, што зрабіла б гонар самаму палкаму нацыяналісту" [1, 290].

Так выдатны грамадскі дзеяч У.К. Стукаліч у сваёй брашуры "Краткая заметка о белорусском наречии"(1895) стаў у абарону гонару Беларусі, багацця і прыгажосці беларускай мовы. Ён патрабаваў ад некаторых літарататараў і палітыкаў, якія з пагардаю ставіліся да беларушчыны: "…каб яны навучыліся разумець той народ, які яны заклікаюць весці да маральнай ды інтэлектуальнай культуры. Калі мы навучымся разумець народ, яго мову, казкі, паданні, мы навучымся любіць яго, навучымся бачыць у ім чалавека" [2, 6]. Ён прывёў шмат аргументаў у прызнанне самастойнасці беларускага дыялекта, што жывая беларуская гаворка " стаіць асобна сярод іншых славянскіх дыялектаў і яе характэрныя адзнакі не паўтараюцца ні ў адной славянскай мове" [2, 19].

Палітычныя ўзрушэнні пачатку ХХ ст., рэвалюцыя 1905–1907 гг., Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. і тыя свабоды, якія ён абвясціў, прывялі да таго, што заходнерусізм як грамадска-культурная плынь афармляецца палітычна. У канцы 1905 г. у Віцебску было створана аддзяленне "Союза 17 октября", аснову якога склалі вядомыя "западноросы" А.П. Сапуноў, У.К. Стукаліч (старшыня аддзялення) і інш. Адной з задач гэтай арганізацыі была барацьба з так званым "польскім уплывам" на Віцебшчыне: "...духовная сущность населения Западного края была, есть и остается русскою. Полякам и другим инородцам, не усвоившим начал русской гражданственности необходимо указать надлежащее место" [3, 7–27].

Дзякуючы новаму выбарчаму закону ад 3 чэрвеня 1907 г. і актыўнасці віцебскіх акцябрыстаў, А.П. Сапуноў стаў дэпутатам III Дзяржаўнай думы. Чалавек, які ніколі не належыў да якой-небудзь палітычнай партыі, цяпер цалкам аддаўся палітычнай дзейнасці, падтрымліваў акцябрыстаў, прытым правае, найбольш рэакцыйнае крыло. Пяць разоў ён выступаў на пасяджэннях Думы і не раз у сваіх прамовах падкрэсліваў самабытнасць беларускага краю і яго народа, самастойнасць беларускай нацыі, патрабаваў улічваць гэта ў заканадаўчых актах Думы. Два апошнія выступленні (1909 і 1910 гг.), па сутнасці, былі прысвечаны беларускай народнасці. Выступаючы па пытанню аб змяненні парадку выбараў членаў Дзяржаўнага Савета, А.П.Сапуноў падкрэсліў, што "беларускае племя" – гэта не толькі праваслаўныя беларусы, але і беларусы-каталікі [4, 31–32].

У 1910 г. на пасяджэнні Віцебскай вучонай архіўнай камісіі А.П. Сапуноў прачытаў публічную лекцыю "Беларусь і беларусы", значная частка якой паўтарала яго прамовы ў Думе. Адзначыўшы, што ў дадзены момант, калі многія народнасці імкнуцца да нацыянальнага самавызначэння, неабходна самавызначыцца і беларусам. Паколькі беларуская народнасць – адна з асноўных народнасцей рускага племені, то ўзмацненне нацыянальнай самасвядомасці сярод беларусаў прывядзе да больш цеснага яднання іх з астатняй Руссю. Разам з тым А.П. Сапуноў яшчэ раз падкрэсліў, што асаблівасці беларускай мовы, звычаяў, багатая народная літаратура пераканаўча даказваюць існаванне асобнага беларускага племені [5,4].

Новае рэвалюцыйнае ўзрушэнне 1917 г., развал Расійскай імперыі, уключэнне ў палітычную дзейнасць новых, маладых сіл прывяло да дыферэнцыяцыі тэарэтычных поглядаў і палітычных установак у шэрагах заходнеросаў. Некаторыя са старых адыходзілі ад палітычнай дзейнасці (А.П. Сапуноў), уліваліся свежыя сілы.

Хутка, пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., ў Віцебску быў створаны Беларускі Народны Саюз. У яго ўвайшлі многія былыя члены віцебскай арганізацыі акцябрыстаў (У.К. Стукаліч, Кудраўцоў, Радкевіч і інш.). Сярод палітычных патрабаванняў БНС на першае месца паставіў беларускае пытанне, якое разумелася як "…объединить всех белорусов Витебской губернии на широких демократических основах в целях наилучшего достижения культурно-экономического процветания родной губернии, а равно и всей Белоруссии, и защиты её политических интересов". Культурна-эканамічны росквіт Беларусі бачыўся яму "в тесном соединении с остальной Россией" [6, 76; 8]. У гэтых мэтах БНС прымае ўдзел у выбарах у гарадскую думу і ва Устаноўчы сход. У снежні 1917 г. прадстаўнікі БНС прымалі ўдзел ва Усебеларускім з'ездзе, дзе адстойвалі ідэю дзяржаўнасці Беларусі ў складзе Расіі.

Дзейнасць гісторыкаў, краязнаўцаў, архівістаў рубяжа XIX–XX стст., якія стаялі на пазіцыях заходнерусізму, збор и публіацыя старажытных дакументаў, прапаганда і папулярызацыя гістарычных ведаў, у тым ліку на лекцыях у Віцебскім настаўніцкім інстытуце і Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута дала плён – была падрыхтавана новая генерацыя вучоных і грамадскіх дзеячаў. Выпускнікі названых навучальных устаноў, якія аддана змагаліся за беларускае нацыянальнае адраджэнне, унеслі значны ўклад у вывучэнне гісторыі Беларусі. Сярод іх гісторыкі і краязнаўцы М.В. Мялешка і Д. Васілеўскі, нарком асветы А. Баліцкі, член першага ўрада БНР К. Езавітаў.

Тое, што новае пакаленне беларускіх дзеячаў, выхаванае сваімі папярэднікамі, пойдзе больш радыкальным шляхам, ад прызнання права беларусаў звацца нацыяй да яго рэалізацыі ў форме дзяржаўнага ўтварэння, стала відавочным ужо летам 1917 г. У чэрвені-ліпені са складу БНС выходзіць група маладых, радыкальна настроеных людзей на чале з М.В. Мялешкам і А.І. Марціноўскім і стварае аддзяленне БСГ (партыі беларускіх сацыялістаў). Яно распачало актыўную дзейнасць па рэалізацыі беларускага пытання. Праводзіліся сходы і распаўсюджваліся пракламацыі, у якіх прапагандавалася ідэя незалежнасці Беларусі, абвяшчалася патрабаванне каб выкладанне ў школах вялося на беларускай мове. Арганізоўваліся публічныя лекцыі па беларусазнаўству [7, 39–40; 8, 12]

Рэпазіторый ВДУ

**Заключэнне.** Вывучэнне і аналіз навуковай і палітычнай дзейнасці прадстаўнікоў заходнерусізму на рубяжы XIX–XX стагоддзяў, калі ішоў бурны працэс станаўлення нацый, а ва ўмовах вострых міжнародных супярэчнасцей рушыліся імперыі, фарміраваліся маладыя нацыянальныя дзяржаўныя ўтварэнні, паказвае эвалюцыю поглядаў, ад прызнання гісторыка-культурнай адметнасці Беларусі да мажлівасці яе нацыянальна-культурнага самавызначэння. Іх выхаванцы пайшлі яшчэ далей, уключыліся ў барацьбу за дзяржаўнае самавызначэнне Беларусі. Таму можна высока ацэньваць уклад гуманітарнай інтэлігенцыі г. Віцебска ў станаўленне беларускай нацыі.

Спіс літаратуры
1. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
2. Стукалич В.К. Краткая заметка о белорусском наречии / В.К. Стукалич. – Витебск, 1895. – 21 с.
3. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 115. – Воп. 1. – Спр. 59.
4. Сапунов А.П. Речи в Государственной Думе III-го созыва. СПб., 1912. 48 с.
5. Сапунов А.П. Белоруссия и белорусы / А.П. Сапунов – Витебск, 1910. – 21 с.
6. Архіў УКДБ па Віцебскай вобласці. – Справа Стукаліча У.К.
7. Архіў УКДБ па Віцебскай вобласці. – Спр. 106.
8. Архіў УКДБ па Віцебскай вобласці. – Спр. 20951-с. – Т. 17.

## ПРАВЯДЗЕННЕ “ТЫДНЯ ДАПАМОГІ ГАЛАДАЮЧЫМ” НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1921 Г.

*Г.Х. Базарэвіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Узаемадзеянне грамадства і дзяржавы з’яўляецца вырашальным фактарам у паспяховай барацьбе з сацыяльнымі праблемамі. З 1921 г. у Савецкай дзяржаве востра стаяла праблема голаду, які ахапіў насельніцтва тэрыторый Паволжа, раёнаў Башкірыі, Урала, Заходняй Сібіры, Казахстана, часткі Паўднёвай Украіны, цалкам больш за 30 губерній [5, с. 14]. Бездагляднасць дзяцей, бежанства, беспрацоўе і вялікі рост смяротнасці сталі наступствамі бедства. У дзяржаўнай праграме Савецкай улады па ліквідацыі голаду ў Паволжы значнае месца адводзілася сацыяльным кампаніям, а менавіта “тыдням дапамогі галадаючым”, якія з’яўляліся спецыфічнай формай супрацы грамадства і дзяржавы ў аказанні дапамогі пацярпелым.

Мэта працы: прасачыць ход і рэалізацыю кампаніі “тыдня дапамогі галадаючым” на тэрыторыі Віцебскай губерні у 1921 г.

**Матэрыял і метады.** Для даследавання былі выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, фонд Віцебскай губернскай камісіі па барацьбе з наступствамі голаду, а таксама заканадаўчыя акты Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту. Падчас працы былі выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Да сакавіка 1924 г. Віцебская губерня знаходзілася ў складзе РСФСР, таму рэалізацыя дзяржаўнай праграмы па барацьбе з голадам у Паволжы на дадзенай тэрыторыі выконвалася адпаведна з заканадаўчымі актамі Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савета Народных Камісараў. Адной з найбольш маштабных і кантралюемых кампаній стаў “Усерасійскі тыдзень дапамогі галадаючым”. Дэкрэтам УЦВК ад 3 верасня 1921 г. у перыяд з 15.10.1921 г. па 15.11.1921 г. быў абвешчаны “Усерасійскі тыдзень дапамогі галадаючым” [4]. На пасяджэнні Віцебскай губернскай камісіі дапамогі галадаючым кампанію вырашана было распачаць з 1 лістапада 1921 г. [1, арк.68].

Мэтай правядзення “тыдня дапамогі галадаючым” з’яўлялася прыцягненне ўсіх савецкіх і прафесійных органаў, шырокіх мас працоўных і сялянства да аказання дапамогі пацярпелым ад голаду ў Паволжы [4]. Праца была накіраваная на збор ахвяраванняў у выглядзе грошай, рэчаў і харчавання.

Падрыхтоўчы этап “тыдня дапамогі галадаючым” заключаўся ў стварэнні “троек” – каардынуючых органаў. Адпаведна з пастановай арганізацыйна-адміністрацыйнае кіраўніцтва і кантроль за правядзеннем кампаніі ў губернях ажыццяўлялі губернскія “тройкі”, куды ўваходзілі старшыня, сакратар і члены. Такія ж “тройкі” ствараліся на ўзроўні ўездаў і валасцей [2, арк. 38].